**Ілюстраваная гульня – віктарына**

**“Любіце гэтую сваю святую зямлю…”**

па творчасці Уладзіміра Караткевіча (VI—VII класы)

**Мэта:** падтрымліваць цікавасць да беларускай літаратуры, творчасці Уладзіміра Караткевіча.
**Задачы:** высветліць веданне вучнямі зместу твораў У. Караткевіча, якія вывучаліся на ўроках беларускай літаратуры ;
садзейнічаць развіццю іх пазнавальнай актыўнасці, культуры маўлення, творчых здольнасцей;
стварыць умовы для абуджэння цікавасці да мінулага, выхавання павагі да старэйшых, пачуцця любові да Радзімы.
**Форма правядзення:** на ўзор гульні «Шчаслівы выпадак».
**Абсталяванне:** мультымедыйны праектар, прэзентацыя, каляровы партрэт У. Караткевіча, карткі з заданнямі і са словамі, рэчы і прадметы для конкурсу «Замарочкі з бочкі», выстава кніг пісьменніка.
**Падрыхтоўчая праца:** вучням загадзя прапануецца літаратура пра жыццё і творчасць У. Караткевіча, даецца заданне перачытаць тэксты твораў У. Караткевіча, якія вывучаліся ў V—VI класах («Нямоглы бацька», «Былі ў мяне мядзведзі», «Лісце», «Лебядзіны скіт», «Бацькаўшчына»); прачытаць аповесць “Зямля пад белымі крыламі”,ствараюцца 2 каманды.
**Эпіграф:**
Быў. Есць. Буду.
Таму, што заўжды, як пракляты,
Жыву бяздоннай трывогай,
Таму, што сэрца маё распята
За ўсе мільярды двухногіх.
*Уладзімір Караткевіч.*

Ход мерапрыемства

**Настаўнік.** Сёння мы праводзім спаборніцтва, якое прысвечана творчасці знакамітага беларускага пісьменніка. Яго прозвішча вы даведаецеся, калі разгадаеце крыжаванку. Гэта і будзе нашым першым конкурсам.

***Першы конкурс* «Разгадай крыжаванку».**

Каманда, якая справіцца першай, атрымлівае 3 б. і становіцца пераможцай конкурсу.



**Пытанні**

1. Беларускі першадрукар.
2. Другі хлеб для беларусаў.
3. Краіна, якую называюць сінявокай.
4. Горад у Віцебскай вобласці, у якім пастаўлены помнік Герою Савецкага Саюза Канстанціну Заслонаву.
5. У якім горадзе нарадзіўся і жыў Кірыла Тураўскі?
6. Лён — гэта «беларускі...»
7. Птушка — сімвал Беларусі.
8. Кветка, якая змешчана на гербе Беларусі.
9. Імя асветніцы зямлі беларускай, што нарадзілася ў Полацку.
10. Белавежская...

**Адказы:**

1. Скарына. 2. Бульба. 3. Беларусь. 4. Орша. 5. Тураў. 6. Шоўк. 7. Бусел. 8. Валошка. 9. Ефрасіння. 10. Пушча.

Настаўнік звяртае ўвагу на эпіграф, паведамляе, што гульня будзе прысвечана жыццю і творчасці Уладзіміра Караткевіча.

### *Другі конкурс* **«Каралеўства крывых люстэрак».**

Камандам прапануюцца карткі, на якіх пазначаны назвы твораў У. Караткевіча. Але ў іх пераблытаны літары.

1. «Л, я, і, ы, д, е, н, з, б, т, і, с, к». *(«Лебядзіны скіт».)*
2. «я, м, о, г, л, Н, ы, ь, б, а, к, а, ц». *(«Нямоглы бацька».)*
3. «а, Б, а, ь, ц, а, к, ш, ў, ы, н, ч». *(«Бацькаўшчына».)*
4. «ы, л, і, Б, ў, я, м, н, е, д, з, м, я, д, з, е, в, і». *(«Былі ў мяне мядзведзі».)*
5. «е, і, с, ц, Л». *(«.Лісце».)*

### *Трэці конкурс* «Просім ў хату,  госцейкі нашы».

Настаўнік раздае карткі з малюнкамі.Пад малюнкамі змешчаны выказванні.Задача вучняў-адшукаць адпаведныя  ілюстрацыі да выдзеленых  выказванняў. За кожны правільны адказ даецца 1 б.

### *Чацвёрты конкурс* «Знайдзі пару».

Вучні атрымоўваюць карткі, на якіх пазначаны імёны герояў з твораў У. Караткевіча. Трэба размеркаваць герояў па парах і прадставіць іх.

**Пары герояў:**
1. Стары — хан.
2. Хлопчык — мядзведзь.
3. Бацька — Пятро.

**Фізкультхвілінка.**
Прагляд відэароліка на песню «Дзе мой край?» (сл. У. Караткевіча, муз. 3. Вайцюшкевіча).

### *Пяты конкурс* «Ты — мне, я — табе».

Каманды загадзя падрыхтавалі пытанні сваім сапернікам. Такім чынам, кожнай камандзе трэба адказаць на два пытанні.

**Пытанні, падрыхтаваныя I камандай**

1. Як бацька з казкі «Нямоглы бацька» дапамог людзям у час голаду? *(Бацька прапанаваў зняць салому са стрэх, абмалаціць яе і сабраць зярняткі.)*
2. Які новы закон прыйшоў на змену старому ў казцы «Нямоглы бацька»? *(Шанаванне сваіх нямоглых бацькоў.)*

**Пытанні, падрыхтаваныя II камандай**

1. У што ператварыўся Стары з твора «Лебядзіны скіт» і чаму? *(Старац стаў каменем, з якога цяклі слёзы.)*
2. Чаму ў скіт змагло змясціцца многа людзей? *(Старац маліўся за людзей.)*

### *Шосты конкурс* «Далей. Далей. Далей»

Камандам прапануецца адказаць на пытанні за адну хвіліну. Калі вучні не могуць даць адказ, яны кажуць слова «далей», і ім даецца наступнае

пытанне. На колькі пытанняў вучні змогуць адказаць, столькі балаў яны атрымліваюць.

**Пытанні для I каманды**

1) У якім годзе нарадзіўся Уладзімір Караткевіч? *(У 1930 годзе.)*
2) Дзе ён нарадзіўся? *(У Оршы, Віцебская вобласць.)*
3) Дзе застала яго Вялікая Айчынная вайна? *(У Маскве, куды ён прыехаў да сястры, якая там вучылася.)*
4) Як называецца першы зборнік паэзіі У. Караткевіча? *(«Матчына душа».)*
5) Кім і дзе ён працаваў пасля заканчэння ўніверсітэта? *(Настаўнічаў на Кіеўшчыне, вёска Лесавічы.)*
6) Назавіце першы надрукаваны твор пісьменніка. *(Верш «Машэка».)*

**Пытанні для II каманды**

1) У якой школе вучыўся пісьменнік пасля Вялікай Айчыннай вайны? *(У сярэдняй школе № 1 г. Оршы.)*
2) У якім горадзе Уладзімір Караткевіч вучыўся ва ўніверсітэце? *(У Кіеве.)*
3) Якому знакамітаму паэту быў прысвечаны верш, надрукаваны ў аршанскай раённай газеце ў 1951 годзе? *(Якубу Коласу.)*
4) Назавіце часопіс, у якім быў надрукаваны першы твор У. Караткевіча. *(Часопіс «Полымя».)*
5) Назавіце адзін з самых вядомых твораў У. Караткевіча, прысвечаны паказу падзей пярэдадня паўстання 1863—1864 гг. *(Раман «Каласы пад сярпом тваім».)*
6) Кім з герояў беларускага мінулага асабліва захапляўся Уладзімір Караткевіч? *(Захапляўся асобай Кастуся Каліноўскага.)*

**Пытанні для III каманды**

1) Колькі дзяцей было ў бацькоў пісьменніка? *(Трое.)*
2) Дзе працаваў У. Караткевіч настаўнікам у 1956— 1958 гг.? *(У Оршы.)*
3) «Чортаў скарб» — гэта казка ці паэма? *(Казка.)*
4) Чым адметны ў жанравым плане твор «Дзікае паляванне караля Стаха»? *(Гэта дэтэктыў.)*
5) Як называецца кніга паэзіі, якая выйшла пасля смерці У. Караткевіча ў 1986 годзе? *(«Быў. ёсць. Буду.»)*
6) У якіх гарадах вуліцы названы імем Уладзіміра Караткевіча? *(У Віцебску і Оршы.)*

Дэманструюцца слайды з фотаздымкамі пісьменніка.

***Сёмы конкурс* «Шыфроўка».**

Вучням прапануецца расшыфраваць запавет У. Караткевіча. Для гэтага трэба размясціць літары ў алфавітным парадку і запісаць склады, якія знаходзяцца побач з літарамі. Камандзе, якая выканае заданне першай, налічваецца 3 б., другой — 2 б., 3 — 1 б.

**Заданне**

| | | | |
|---|---|---|---|
| **У** - ю | **Л** - бе | **Х** - за | **Р** - хто |
| **К** - ся | **Ф** - ву | **Ь** - сё | **Ш** - той |
| **Ж** - ва | **З** - е | **Ё** - бы | **Ц** - быў |
| **А** - Хто | **Б** - сва | **Г** - прод | **В** - іх |
| **М** - губ | **Е** - за | **Ы** - у | **Н** - ля |
| **Э** - згу | **Ю** - біў | **Д** - каў | **Т** - ну |
| **Я** - ! | **О** - е | **Ч** - , | **П** - ; |
| **І** - , | **Й** - той | **С** - род | **Ў** - мо |

**Адказ.**
Запавет У. Караткевіча з казкі «Нямоглы бацька»: «Хто сваіх продкаў забывае, той сябе губляе; хто родную мову забыў, той усё згубіў!».
**Настаўнік.** Няхай гэтыя словы пісьменніка стануць запаветам для вас на ўсё жыццё!
Пасля заканчэння гульні журы падводзіць вынікі і ўзнагароджвае каманды пераможцаў.